**Заключение.** В ходе исследования были выявлены особенности процесса создания детских книг, который имеет особые технологические процессы, основанные на ручной сборке изделий, а использование складчато-разрезных структур в детских изданиях придает им уникальность и позволяет быть конкурентно способными в активно развивающейся цифровой культуре.

1. Герасимов, А. А. Макетирование из бумаги и картона : учебно-методическое пособие / А. А. Герасимов, В. И. Коваленко; [в авторской ред.] ; М-во образования РБ, УО "Витебский гос. ун-т им. П.М. Машерова", Каф. дизайна, декоративно-прикладного искусства и технической графики. – Витебск : УО "ВГУ им. П.М. Машерова", 2010. – 167 с. URL: https://rep.vsu.by/handle/123456789/2249 (дата обращения: 22. 01. 2023)

2. Романова Е.О. Книги поп-ап, или «книги-забавы», вчера и сегодня // Искусство Евразии. – 2018. – №4(11). – С. 56-67.

3. Кузнецова, Ю. Из истории возникновения pop-up books [Электронный ресурс] / Ю. Кузнецова – Режим доступа: https://yulyakuznezowa.blogspot.com/2016/10/pop-up-books-i.html. – Дата доступа: 11. 01. 2023.

# ДА ПЫТАННЯ ЭКСПАНАВАННЯ НАІЎНАГА МАСТАЦТВА Ў МУЗЕЙНЫХ УСТАНОВАХ

*А.С. Ге*
*Віцебск, УК «Музей Марка Шагала ў Віцебску»*

Наіўнае мастацтва нячаста бывае прадстаўлена ў экспазіцыйнай дзейнасці віцебскіх музеяў, за выключэннем праекта «Інсіта» і экспазіцый у выставачных залах, прызначаных паводле іх канцэпцыі для дэманстрацыі прац мастакоў-аматараў. Тым не менш нешматлікія выставы інсітнай творчасці выклікаюць цікавасць у гледачоў. Таксама дэманстрацыя наіўнай і брутальнай творчасці ў рамках дзейнасці музеяў сучаснага мастацтва ўжо даўно з'яўляецца актуальнай тэндэнцыяй. У гэтай сувязі ўяўляецца актуальным вывучэнне досведу канцэптуальнага абгрунтавання выстаў наіўных мастакоў і выкарыстоўваемых для іх экспазіцыйных стратэгій і прыёмаў. Практыка арганізацыі ўдалых праектаў дазваляе гэта зрабіць. Адным з прыкметных праектаў стаў паказ прац Зінаіды Баулінай «Качкі Бабы Зіны», куратарамі якога выступілі Сяргей Чарцілін і Алена Ге.

Мэта даследвання: сапастаўленне канцэпцыі і экспазіцыі праекта інсітнага беларускага мастацтва з актуальнымі тэндэнцыямі экспазіцыйнай дзейнасці сучастных музеяў.

**Матэрыял даследвання**. творчыя працы Зінаіды Баулінай, прадмет даследвання: канцэпцыя і прыемы экспазіцыі.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Для выставы «Качкі бабы Зіны» былі адабраныя вобразы качак і лебедзяў, якія складаюць умоўную серыю. Усе птушкі намаляваныя ў профіль, у статычным стане, іх выявы плоскасныя, спрошчаныя. Некаторыя з птушак пафарбаваны ў лакальныя колеры, у асобных кантрасным колерам вылучаныя дэталі (контур крыла, галава, шыя), іншыя аздоблены раўнамерна размешчанымі кропкамі, рысачкамі, арнаментальнымі фрагментамі. Фон прац як аднатонны, так і стракаты, з мазкоў або плям, якія

прадстаўляюць альбо ўмоўныя выявы расліннасці, як элементаў краявіду, так і арнаментальныя, альбо дынамічныя патэрны. З. Бауліна стварала сваіх птушак, не змешваючы фарбы, аднак вельмі часта накладаючы адзін пласт на іншы, за кошт чаго атрымлівала складаны колер; абводзячы контуры тоўстымі амаль бесперапыннымі лініямі, мастачка таксама клала фарбу на контур малюнка, атрымліваючы іншае адценне колеру. Такая манера працы, пры ўсёй пастознасці маляўнічага пласта, у некаторых працах нагадвала эфект літаграфскага друку пры накладанні колераў.

«Бабуля, як сапраўдны творца, хацела ўпрыгожыць свой хатні побыт, парадаваць суседзяў. На свет сталі з'яўляцца кранальныя сваёй прастатой вобразы качачак, лебедзяў, кветак, раслін… Шмат карцін баба Зіна дарыла тым, каму яны былі па душы. Тым не менш пацiху калекцыя стала назапашвацца… Так глядач пазнаёміцца з наіўнай творчасцю бабулі Зіны, ад якога павявае цеплынёй, душэўнасцю і шчырасцю» [1].

Так, асновай ідэі куратара з'явілася стаўка на эмоцыі ў паказе мастацкіх прац гледачу, што часцей за ўсе бывае выйгрышна. У выпадку наіўных мастакоў заўседы асноўнай матывацыяй выступае шчырасць, душэўнасць і цеплыня. З наіўным жывапісам часта параўноўваюць дзіцячыя малюнкі, з іх свежасцю, нявіннасцю, непасрэднасцю. Аднак, неабходна прызнаць, што дзіцячыя малюнкі маюць тое агульнае з карцінамі наіўных мастакоў, што яны не з'яўляюцца ні нявіннымі, ні спантанымі: як і наіўны мастак, дзіця імкнецца да вызначанага поспеху: «Я збіраюся зрабіць прыгожы малюнак,» – кажа дзіця, яно хоча быць адзначаным, хоча парадаваць блізкіх, перасягнуць сваіх аднагодкаў. Тут уяўляюцца няправільнымі, ці, па меншай меры, няпоўнымі псіхааналітычныя інтэрпрэтацыі дзіцячай і наіўнай творчасці як мімавольных праяваў псіхалагічнага стану. Дзіця з самага ранняга ўзросту праяўляе матывацыю да стварэння твораў, а не проста выражае свой ўнутраны стан. Так і наіўная мастачка баба Зіна ставіла перад сабой мэту ўпрыгожыць дом, парадаваць блізкіх і суседзяў, дорачы ім карціны. Менавіта падобную матывацыю сучасныя даследчыкі інсітнай творчасці лічаць асноўнай для тэрміналагічнага размежавання паміж наіўным мастацтвам і ар брут, у якім пераважае чыстае самавыяўленне [2, с. 39].

У той час як дзіця імкнецца да вызначанага поспеху, спрабуючы маляваць, як дарослы, куратар выставы наіўнага мастацтва імкнецца да супрацьлеглага поспеху, спрабуючы выклікаць эмпатыю гледача паказам мастацтва, дзе дарослы чалавек стварае «як дзіця». Асаблівасць сітуацыі ў тым, што ў сваім завершаным выглядзе вызначэнне мастацтва як вялікага пытання, як «рэчы ў сабе», здаўна стала тоесна яго паказу ў прасторы музея [3, ст. 102]; глядач, прыходзячы ў музей, часта настроены ўбачыць тут нешта, што ён, як непрафесіянал ў галіне візуальных мастацтваў, стварыць тэхнічна не можа. Такім чынам, для прадстаўлення наіўнага мастацтва

ў прасторы мастацкага музея важны, перш за ўсё, момант выбару стратэгіі прэзентацыі, паколькі традыцыйныя прыемы паказу не заўседы дапамагаюць гледачу ўхапіць саму сутнасць мастацтва, мэту яго паказу ў музеі, так як многія наведвальнікі ідуць у музей з пэўнай устаноўкай – не за пачуццямі і настроем, а за здзіўленнем майстэрству і адчуваннем элітарнасці. Музей павінен стаць тым месцам, дзе адбываецца момант прадстаўлення нейкіх варыянтаў «апавядання», што дазваляюць рэчы быць інтэрпрэтаванай у якасці твору мастацтва. Падобнае апавяданне ў праекце «Качкі бабы Зіны» мела два складнікі: размяшчэнне прац у прасторы, на розных узроўнях, што дазваляла гледачам хадзіць паміж імі, як у лесе, ці як сярод жывых птушак на прыродзе; размяшчэнне на сценах залы інфармацыі пра аўтара, куратарскіх інтэрв'ю і кароткіх звестак аб практыцы экспанавання наіўнага мастацтва на прафесійных пляцоўках.

Зала ўяўляла сабой прастору «белы куб». Неабходна было ліквідаваць дысананс паміж архітэктурнай прасторай і наіўным жывапісам. Абраны быў метад адкрытага экспанавання ў прасторы. Высокая столь памяшкання была перавагай, якая дапамагала выканаць задачу. Працы прыкладна аднаго фармату падбіраліся ў серыі па 2, 3 ці 4 дошкі і размяшчаліся радамі на ляску пад living рознымі вугламі, утвараючы падабенства лабірынта або «чароўнага лесу», па якім глядач мог хадзіць у любых напрамках, знаёмячыся з персанажамі-птушкамі. Такая экспазіцыя мела на мэце затрымаць меркаванне гледача, які б мог хутчэй выдаць свае «і я так магу», калі б працы былі размешчаны традыцыйна на сценах у рамах. Такім чынам стваралася сітуацыя гульні, трапляючы ў якую глядач прасякаўся эмпатыяй хутчэй, чым выносіў свой вердыкт. Інфармацыя размяшчалася на сценах невялікімі блокамі, таксама каб наведвальнікі маглі знаёміцца з ёй паэтапна, па настроі.

Дошкі з вялікімі птушкамі на іх прыпадабняліся каляровым масам, некалькі гратэскавым і плоскім, візуальнае ўспрыманне якіх можна апісаць амаль як тактыльнае. Птушкі бабулі Зіны наблізілі візуальнае да субстанцыі, якую можна памацаць, – і да рэальнасці; спрошчаныя і «няўмела» намаляваныя, яны апынуліся бліжэй да рэальнасці, чым падабенства да натуры жывапіснага рэалізму.

**Заключэнне.** Канцэптуальнае абгрунтаванне і адмыслова пабудаваная экспазіцыя твораў наіўнага мастацтва на прафесійных пляцоўках дапамагае ўзбудзіць цікавасць гледачоў, прыцягнуць іх да «культуры ўдзелу», што палягае ў рэчышчы сучасных тэндэнцый мастацтва.